УДК 008.161.3

# МАСТАЦКАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ ІДЭІ КАНСАЛІДАЦЫІ ШЛЯХТЫ І СЯЛЯНСТВА Ў ТВОРЧАСЦІ У. КАРАТКЕВІЧА

**П.К. Банцэвіч**
УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт"
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Наследие В.Короткевича рассматривается через призму культурологии и трактуется как явление не только в литературе, но и в культуре. Выявлены образы, символы творчества писателя, которые имеют непосредственное отношение к глубокому познанию особенностей белорусской культуры.

V.Korotkevitch's legacy is considered in the light of cultural science and treated not only as literary but as cultural phenomenon. The images, symbols of the writer's work are found. They are connected with deep knowledge of peculiarities of Belarussians culture.

Рамантычна-узвышанае выяўленне адносін да жыцця ў цэлым не характэрна для менталітэту беларусаў. Прыхільнасць да звычайных зямных каштоўнасцяў, кансерватыўнасць, эстэтычная стрыманасць, шанаванне прыродных пачаткаў жыцця, з якімі былі звязаны гаспадарчыя інтарэсы, матэрыяльныя клопаты чалавека, урэшце, сямейна-побытавая культура – вось, бадай, асноўныя асаблівасці беларускага светабачання. І таму У.Караткевіч па сіле сваёй энергетыкі, эмацыянальнасці, яркасці выглядае фігурай не зусім арганічнай, хутчэй нават асобнай выбуховай з'явай у досыць роўнай, не бурлівай знешне, плыні быцця народу. Беларусы паводле гістарычна сфармаванага менталітэту ўсё ж не рамантыкі. Аднак У.Караткевіч у сваіх творах вылучае на авансцэну жыцця вобразы тытанічных асоб, асветнікаў, першапраходцаў, прарокаў, геніяў, нават касмічныя вобразы «тых, хто носіць небасхіл у сэрцы, хто за Край Свой Родны, за ўсе Народы паўстане нават на Бога», імкнучыся засведчыць, што і беларусам зусім не чужыя ўзвышаная мара і бунтарскі дух.

Героя́ў У.Караткевіча характарызуюць абвостраная грамадзянска-патрыятычная ўстурбаванасць, непахісна-вытрыманая рыцарская пазіцыя, вышыня і размах рамантычных парыванняў, гатоўнасць ісці на крыж, каб выратаваць свой народ, у якім жыве не толькі страх, але і пакорлівасць, абыякавасць да ўласнага лёсу. Таму пісьменнік намагаўся фарміраваць у беларусаў пачуцці самапавагі, самакаштоўнасці, годнасці, страчаныя за трыста гадоў знаходжання ў складзе іншых дзяржаў. У якасці патрыятычнага ўрока сучаснікам у творчасці У.Караткевіч выступае паўстанне 1863-1864 гадоў, яго вызваленчы рух, ідэі нацыянальнага і культурнага адраджэння.

Ва ўмовах Расійскай імперыі культура Беларусі развівалася ў рэчышчы моцнага супрацьстаяння інтарэсаў Расіі і Польшчы, якія



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

прэтэндавалі на мясцовыя духоўныя каштоўнасці, залічваючы іх у сваю ўласнасць. Фармальнай падставай было тое, што ў культурнай прасторы Беларусі шырока практыкавалася польская мова – спадчына Рэчы Паспалітай, і руская мова, якая ўкаранялася ў публічны ўжытак як інструмент ідэалагічнага ўціску з боку дзяржавы. Беларуская ж ідэя пачыналася з рамантычнага культу Літвы, паэтызацыі яе гераічнага мінулага і развівалася ў кантэксце патрабаванняў кансалідацыі шляхты і сялянства дзеля вызваленчай барацьбы супраць агульнага ворагу – рускага царызму. У саслоўным збліжэнні спадзяванні ўскладваліся і на шляхту, якая павінна была інтэлектуальна ўзбагаціць працоўнага чалавека, і на сялянства, ад якога чакалася маральнае аздараўленне гаспадароў маёнткаў, далучэнне іх да традыцый народнай духоўнасці.

У.Караткевіч у сваіх поглядах і захапленнях балансуе паміж шляхтай і сялянствам, стараючыся зблізіць і нават паяднаць іх. Алеся Загорскага («Каласы пад сярпом тваім»), нашчадка княжацкага роду, аддаюць на выхаванне ў сялянскую сям'ю, каб ён рос разам з сялянскімі дзецьмі, каб не стаў пестам і беларучкам, «каб ведаў як даецца зямля, каб не збэсціўся на сабаку» [1, с. 18]. Такі звычай называўся «дзядзькаванне» і быў пашыраны на Беларусі ў XVI-XVII стагоддзях, а ў XIX стагоддзі (час, які адлюстраваны ў рамане) ужо не існаваў. Можна зрабіць вывад, што празаік, парушаючы храналагічныя рамкі, свядома ўводзіць у сюжэтную канву твора старажытны звычай, каб яшчэ раз сцвердзіць ідэю аб адзінстве памкненняў адукаванага чалавека з інтарэсамі простых людзей працы.

З мэтай разбурыць ідэалагічныя стэрэатыпы свайго часу наконт беларускай нацыі, у якой культуратворчую ролю адыгрывала, быццам, толькі сялянства, мастак паказвае беларусам, што ў іх за плячыма вялікая гісторыя, культура, прычым, не толькі простанародна-сялянская, але і элітарная, шляхецкая, гераічная. Па прызнанні У.Калесніка «Караткевіч марыў адрадзіць арыстакратызм, элітарнасць. Арыстакраты ў яго не абібокі, а рабачаі духу, соль зямлі, патрыёты, ахвярнікі, краса жыцця» [2, с. 131].

У.Караткевіч даказвае, што асноўныя кадры беларускай інтэлігенцыі фарміраваліся пераважна з шляхты, уводзіць у свае творы ў якасці герояў асабліва аўтарытэтных дзеячаў культуры В.Дуніна-Марцінкевіча, У.Сыракомлю, С.Манюшку, Ф.Багушэвіча, каб паказаць адзінства шляхоў народу і лёсаў патрыятычна настроеных асобаў. Паводле У.Караткевіча, гэта ў асяроддзі шляхты прагучаў голас у абарону роднай мовы і культуры супраць іншаземнага засілля на беларускіх землях, за неабходнасць беларускай дзяржаўнасці.

Пісьменнік разглядаў шляхту як частку нацыі, адкрыта сімпатызаваў тым з іх, хто не страціў сувязі з сялянствам і заставаўся сынам сваёй зямлі. Творца рамантычна ўзвышае былую славу беларускай шляхты, яе інтэлектуальныя і баявыя заслугі перад народам. Гэтак жа рамантычна рэзка мастак развенчвае маральна дэградаваную, адарваную ад нацыянальных асноў жыцця шляхту.

Беларуская шляхта, імкнучыся атрымаць ад Польскай Кароны прывілеі, ахвяравала рэлігіяй і культурнымі здабыткамі свайго народу ў імя ўласных матэрыяльных выгод. Услед за пераменай канфесіі шырокія колы беларускай шляхты пераходзілі на польскую мову. Адбываецца раскол у самасвядомасці беларусаў, які суправаджаецца з'яўленнем біэтнічнай, а затым і зменай самаідэнтыфікацыі адукаванага слою. Вёска ж трывала захоўвала жывую беларускую мову, супраціўляючыся культурна-моўнай асіміляцыі.

У аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» Н.Яноўская, адчуваючы ўласную віну за шляхту, скажа: «Мы гандлявалі радзімай, прадавалі яе хцівым суседзям, а сяляне любілі яе, сваю мачыху» [3, с. 38]. Стары Вежа («Каласы пад сярпом тваім»), асуджаючы здрадлівае панства, усклікае: «А што ў іх за душою?! Расея ў іх за душою?! Польшча ў іх за душою?! Свая зямля?! Польшчу яны прапілі, свая зямля ім – мачыха» [1, с. 240]. Адчуванне сваёй зямлі як мачыхі высвятляе сірочы лёс народа. «І ўсё ж непрытульны мы народ. І пакуль гэты народ будзе дурнем, так будзе заўсёды. Аддае чужынцам лепшых сваіх сыноў, лепшых паэтаў, дзетак сваіх наракае чужынцамі, прарокаў сваіх, быццам вельмі багаты. Аддае сваіх герояў на прэнг, а сам сядзіць у клетцы над міскай з бульбай ды бручкай і лыпае вачамі» [3, с. 71-72].

Многія творы У.Караткевіча («Сівая легенда», «Маці ветру», «Нельга забыць») азначаны глыбокім трагічным пафасам: «уся Беларусь – адзінае поле смерці, над якім вые вецер» [4, с. 108]. Мастак бачыць карані трагізму ў вялікіх фатальных стратах беларусаў, пасля якіх нацыянальная свядомасць ніяк не можа адрадзіцца. Гэта страта збройнай шляхты, саслоўны разлад, нацыянальная здрада. Р. Ракутовіч («Сівая легенда») гнеўна абвінавачвае рэнегатаў: «Да чаго вы народ русінскі, божы народ давялі ў подласці сваёй? Дзеў на чужацкі ложак шпурнулі, краіну ўсю! Слёзы яе вам сэрца не абцяжарваюць?! Веру змянілі, хрыстапрадаўцы! Народ прадалі, гандляры!» [4, с. 43].

У «Дзікім паляванні караля Стаха» У.Караткевіч паказаў, як шляхта ў часы Расійскай імперыі замест таго, каб кансалідавацца з сялянствам дзеля вырашэння агульнанацыянальных вызваленчых задач, у пагоні за грашыма нішчыць народнае багацце – сваю спадчыну, духоўнасць, звычаі, дзякуючы якім і існуе народ. Нават



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

высакароднае мінулае можна запляміць і паставіць на службу карыслівым мэтам. Старажытную легенду пра паляванне мужнага караля Стаха які збіраўся вызваліць свой народ, шляхта выкарыстоўвае ў сваіх інтарэсах, адымаючы ў караля добрае імя і пераўтвараючы яго ў жахлівага разбойніка. І людзі праклінаюць караля Стаха, замест таго, каб берагчы светлую памяць аб ім.

Мастак тужыць па тых часах, калі на Беларусі існавала рыцарства: «Рыцарства заняпала. Яго няма. Мы з вамі, як дрэвы на лядзе» [1, с. 85], «Дзе яны зараз, усе гэтыя людзі з гарачай крывёю і палкімі жаданнямі, колькі стагоддзяў прагукацела па іх спарахнелых касцях?» [4, с. 20]. Беларускае рыцарства здабывала правы на волю мячом і вастрыём дзіды пад час аблог беларускіх гарадоў. Саслоўі і рангі не адыгрывалі тут істотнай ролі, часта «гаспадар» ішоў на дыбу поруч са сваім «халопам». Саслоўны разлад паміж шляхтай і сялянствам, паяднаных раней ратнай храбрасцю, сталі, на думку У.Караткевіча, сапраўднай духоўнай катастрофай этнаса: «Вякамі ішла гэтая мяжа паміж аднымі і другімі – і вось канец, лагічнае завяршэнне: адзічэнне, цемра ва ўсёй дзяржаве, тупы жах, голад, вар'яцтва» [3, с. 108].

Прыгнечанаму сялянству, якое ўяўляла сабою абстрактную грамаду, пазбаўленую актыўнасці і руху, патрэбен быў выказнік думак, заступнік, здольны разбудзіць і павесці за сабою: «Не імамы князя, правадыра і прарока і, як лісце, мяцемся па грэшнай зямлі» [5, с. 149]. І У.Караткевіч стварае комплексны вобраз змагара за народ і радзіму, носьбіта аўтарскай ідэі еднасці правадыра і народа, шляхціца і мужыка.

Вобраз тытанічнай асобы па-рознаму вар'іруецца ў творах. Гэта князь-мужык Алесь Загорскі («Каласы пад сярпом тваім»), мужыцкі кароль («Дзікае паляванне караля Стаха»), урэшце, гэта «мужыцкі Бог» («Хрыстос прызямліўся ў Гародні») – усе яны здольны сінтэзаваць жыццёвую неабходнасць усенароднай вызваленчай барацьбы.

У канцэпцыю творчасці У.Караткевіча ўдала ўпісваецца і вобраз А.Беларэцкага («Дзікае паляванне караля Стаха»). Мастак наўмысна робіць яго вучоным-фалькларыстам, які збірае народныя песні, казкі, легенды. Выцясненне беларускай мовы з літаратурнага ўжытку пад час знаходжання ў складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, прывяло да сітуацыі, калі беларускі народ павінен быў клапаціцца не столькі пра развіццё, колькі пра захаванне некалі створаных духоўных каштоўнасцяў. Пазбаўлены права на нацыянальную пісьменнасць, народ, каб чымсьці кампенсаваць страчанае, выявіў тытанічную энергію ў развіцці вуснай творчасці. У XIX стагоддзі навукоўцы адкрылі вялікія скарбы фальклору беларускага этнасу, які, быццам бы,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

не існаваў, лічыўся «древнейшей ветвью русского племени». У перыяды нацыянальна-вызваленчых уздымаў апорай для ўзмацнення нацыянальнай свядомасці станавіліся нястрачаныя духоўныя каштоўнасці народа. А.Беларэцкі, збіраючы гэтыя каштоўнасці, прагне адчуць асабіста і данесці да іншых самабытнасць беларусаў: «Я тады шукаў свой народ і пачынаў разумець, што ён тут, побач, толькі за два стагоддзі з нашай інтэлігенцыі добра выбілі гэта разуменне. Таму і працу сабе я выбраў незвычайную – зведанне гэтага народа» [3, с. 7].

Шукаюць свой народ А.Грынкевіч («Нельга забыць»), У. Берасневіч («У снягах драмае вясна»), А. Косміч («Чорны замак Альшанскі»). Гэта ўжо створаныя творчым талентам У.Караткевіча маладыя беларускія інтэлігенты XX стагоддзя, людзі, якія маюць шляхецкія радаводы і адчуваюць багатае духоўна-гістарычнае заплечча. Усе яны займаюцца грамадскай культурнай дзейнасцю (фальклярысты, мастацтвазнаўцы, паэты, гісторыкі), даказваюць самабытнасць беларусаў як народа шляхам нацыянальнага самавыяўлення ў галіне культуры.

Зварот пісьменніка да гераічнай гісторыі, да культурных здабыткаў мінулых пакаленняў, да тэмы шляхты, нацыянальнай эліты, інтэлігенцыі, вызначаў яго прагу здзейсніць пералом ў грамадскай свядомасці, зрабіць пераацэнку ўстойлівых стэрэатыпаў наконт лёсу, менталітэту беларусаў, наконт самога паняцця «беларускі народ». У.Караткевіч дыдактычна выяўляючы каштоўнасці высокага рангу, дэманстратыўна і гучна абвяшчаў: «Беларус – чалавек высокага інтэлекту, маралі, шырокіх поглядаў, еўрапейскай культуры і адукаванасці, талерантны, верны свайму ідэалу. Беларускі народ – «людзі з ганаровым мінулым, славе і мужнасці, розуму і таленту якіх могуць пазайздросціць вельмі і вельмі многія, і што толькі ад іх залежыць, каб гэтая слава тых, хто назаўседы ішоў і ідзе наперадзе, не прапала ў бягучых вяках, каб яны заўседы былі поўныя высокай годнасці ў кожным слове і ў кожным учынку» [6, с. 204].

**ЛІТАРАТУРА**

1. Караткевіч, У. Збор твораў: У 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1987-1991.– Т.4: Каласы пад сярпом тваім: Раман: У 2 кн. Кн. 1. – 399 с.
2. Калеснік, У. Усё чалавечае: Літаратурныя партрэты, нарысы / У. Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1993.– 381 с.
3. Караткевіч, У. Збор твораў: У 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1987-1991.– Т.7: Дзікае паляванне караля Стаха: Аповесць; Чорны замак Альшанскі: Раман. – 574 с.
4. Караткевіч, У. Збор твораў: У 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1987-1991.– Т.2: Аповесці, апавяданні, казкі. – 1998. – 511 с.
5. Караткевіч, У. Збор твораў: У 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1987-1991.– Т.8. У 2 кн. Кн. 1: П'есы. Нарыс. – 590 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

6. Караткевіч, У. Збор твораў: У 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1991.– Т.8. У 2 кн. Кн. 2: З жыццяпісу, нарысы, эсэ, публіцыстыка, постаці, крытычныя творы, інтэрв'ю, летапіс жыцця і творчасці. – 495 с.

УДК 1(091) + 303.442.43

# СЕМИОТИЧЕСКИЙ ПОДХОД К ПОНИМАНИЮ ИДЕОЛОГИИ: ТЕОРЕТИЧЕСКИЕ ПРЕДПОСЫЛКИ

**Бурсевич В.В.**

УО «Белорусский государственный университет»

г. Минск, Республика Беларусь

В статье рассматриваются идеи представителей семиотического подхода к пониманию человека и культуры. Автор делает попытку реконструировать теоретические установки, сформулированные классиками семиотического подхода, которые лежат в основе современных концепций, рассматривающих идеологию как знаковый феномен.

The article examines the ideas of the representatives of semiotic approach to human and culture. The author tries to reconstruct the main theoretical backgrounds stated by the classical authors of semiotic approach that underlie contemporary conceptions of ideology as sign phenomenon.

В философской мысли сформулировано множество подходов к пониманию феномена идеологии, однако во всем этом многообразии особое место занимают те направления исследования идеологии, которые поднимают вопрос о ее взаимосвязи с языком, т.е. затрагивают проблему семиотической (знаковой) природы идеологии. С этой точки зрения оправданным было бы, с одной стороны, рассмотреть исторические истоки и предпосылки подобной постановки вопроса об идеологии. А с другой – выявить теоретические основания, которые, в принципе, позволяют связать феномены идеологии и языка в некую единую цепь явлений и которые фундируют современные семиотические концепции идеологии.

Идеи о связанности языка и идеологии, рассматриваемой как коллективно разделяемые идеи, национальная культура или так называемый «народный дух», появляются уже в Новое время. В этом отношении работу И.Г. Гердера «Идеи к философии истории человечества» можно воспринимать не просто как масштабное исследование национального духа, но и в каком-то смысле как попытку построения национальной идеологии, в рамках которой огромное значение придается феномену языка.

Еще более детально разработанную концепцию роли языка как определяющего фактора национальной культуры предлагает В. фон Гумбольдт. Главной особенностью лингвистического учения В. фон



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ